Лескець Сяргей

# Гасьцінец






Васкевічы
2003

*Лескець Сяргей*

*зборнік першых эсэяў*

# Гасьцінец



Выдавецкае таварыства

Мястэчка
Заскевічы-Маладэчна-Менск



**Выдавецкае таварыства **Мястэчка****

*Папярэднікам прысьвячаецца*

Прадмова

Гасьцінец--неадменны атрыбут кожнага госьця. З дзяцінства памятаецца прынесены з поля "зайчыкавы хлеб", які, нібыта заяц прасіў перадаць табе. І чамусьці лустачка падавалася табе смачнейшай за звычайны хлеб.

Гасьціненц--гэта яшчэ і дарога: такую назву яна атрымала ад слова госьці (у сэнсе "купцы"). Яшчэ, магчыма, і ад таго, што купцы прыносілі з сабой сьвежыя навіны, расповеды—трэ пагадзіцца, так-сама нядрэнны гасьцінец. Таму, як мне падаецца, слова для назвы даволі трапнае.

Кніга гэтая,--перш за ўсё збор ўспамінаў местачкоўцаў пра былое жыцьцё, заняткі, звычаі, сьвяты. Накапіўся багаты матэрыял, не ўвесьці які ў карыстаньне было б вялікай памылкай. Таму пры першай жа нагодзе--неабходнасьці напісаць эсэй на першым курсе Беларускага калегіюма--я ўзяўся за працу. Першапачаткова на мэце мелася паказаць мястэчка з моўнымі і этнаграфічнымі асаблівасьцямі, багатай і цікавай, але, на жаль, забытай тапанімікай. У выніку матэр'ял атрымаўся б збольшага чыста этнаграфічным а таму сухім і не цікавым. Але дзякуючы Беларускаму калегіюму і, у прыватнасьці, Тацьцяне Рошчынай, ужо на першым курсе я змог працаваць з рэдкімі кнігамі—атрымалася даволі грунтоўная праца. Ня буду сябе хваліць, але нават самому прыемна. Калі трымаеш у руках ужо падрыхтаваны макет кнігі, міжволі забываешся пра тое, колькі часу праведзена ў бібліятэцы і ўласна за напісаньнем, наборам, вёрсткай, карэктаваньнем. Падаецца, каб былі добрыя вынікі працы трэ мець крыху ўвагі, больш прыглядацца да ўскосных дадзеных, гісторыі суседніх мястэчкаў, умець аналізаваць...

Эмацыйна эсэй поўніцца болем і настальгіяй па страчаным, па незваротным. І хоць Гісторыя сьведчыць, што з Заскевічамі не зьвязаная ніводная вядомая асоба, калі не лічыць Льва Сапегі, гісторыя вельмі багатая.

Спадзяюся, гэтая кніга кагосьці натхніць на дасьледваньне і ягоннай мясцовасьці. Хачу толькі сказаць, што на самым пачатку акрамя легенды, я зусім нічога ня ведаў. Ды нават і тая легенда апказалася толькі прыдумкай, не адпавядаючая рэчаіснасьці.

Аўтар.

## Там мае карані

*Гісторыя-гэта ўваскрашэньне.*
*Уваскрашаючы падзеі нашае даўніны,*
*мы абуджаем ад летаргічнага сну нашу памяць, а*
*разам зь ёю і самі ўваскрасаем як эўрапейскі народ.*
*У. Арлоў. «Галерэя Кліо» Радыё Рацыя.*

Праязджаючы па дарозе з Маладэчна на Смургоні, вы ня зможаце прамінуць гэтую вёску; шэрую, змрочную, банальную пасавецкую вёску. Але ці заўсёды яна была такой? Як тут было даўней? Хто і як тут жыў, і як мінулае былога мястэчка ўплывае на ягоную сучаснасьць?

Легенда аб заснаваньні мястэчка распавядае, што адзін габрэй-прадпрымальнік пабудаваў карчму на шляху з Менска ў Вільню. Кожны падарожны, які меў у тым патрэбу, мог «заскочыць» у карчму, выпіць чарку гарэлкі, зьесьці яешню, а то й пераначаваць.(1)

Паступова слова «заскочыць» трансфармавалася ў тапонім--Заскевічы. Пасьля Другой сусьветнай вайны, пры ліквідацыі ў 1960 годзе Маладэчанскай вобласьці, назву мястэчка палічылі палянізмам і замянілі на «более родную»--Заскавічы.

Задума габрэя была добрая, бо лепшага месца, як перакрыжаваньне шляхоў знайсьці наўрад ці ўдалося б: тут і дарога з Смургоней на Лебедзева й далей на Маладэчна, да Менска, Навагрудка, Ліды дзесьці па сто кілямэтраў, крыху далей да Вільні. Цікавы й той факт, што мястэчка знаходзіцца ў месцы разьдзяленьня гэтых шляхоў на палову, і ў адносінах да ўсіх сталіц з часоў Вялікага княства Літоўскага ў амаль аднолькавай адлегласьці.

Мястэчка стаіць ня толькі на перакрыжаваньні дарог, але й на перасячэньні гісторыка-культурных шляхоў. Варта прыгадаць Залесьсе, дзе блізу дваццаці гадоў пражыў Міхал Клеафас Агінскі-менавіта тут ён напісаў своё славуты палянэз; Лоск, дзе ў сямідзясятыя-васьмідзясятыя гады XVI стагодзьдзя працавала адна з васьмі ў дзяржаве пратэстанцкіх друкарняў, а на працягу 1573—1583 гадоў жыў Сымон Будны; Беніца, дзе добры прамежак часу дзейнічаў кляштар бернардынаў і кармелітаў з уласнымі архівам, бібліятэкай, мастацкай галерэяй; Крэва, дзе ў 1385 годзе падпісана Крэўская унія; Лебедзева,

дзе яшчэ ў 1476 годзе пры падтрымцы Аляксея Сяменавіча Гальшанскага быў пабудаваны касьцёл; Смургоні, славутыя помнікам рэнесансу 1606-1612г.г. кальвініcцкім зборам, а таксама сваёй мядзьвежай акадэміяй і найсмачнейшымі *абваранкамі*, якія пазьней будуць лічыцца рускімі традыцыйнымі прысмакамі...

Таму й ня дзіўна, што першая згадка пра Заскевічы датуецца 1476 годам.Крыніца сьведчыць: **Кароль**(Казімір IV) **прызволіу..Алехну Санькговічу пяць чалавекаў Жаскавічы. Пан Даукгірд і пан Кгастау,**(падцьвердзілі) *(2)*



***Подпіс Жыгімонта Аўгуста***

Гэтыя зьвесткі надзвычый каштоўныя, бо асьвятляюць самы пачатак гісторыі пасяленьня, пра якое, у лепшым выпадку, можна даведацца толькі з легендаў. Тут пад словам Жаскавічы маецца на ўвазе яшчэ ня вёска, а прозьвішча пачынальнікаў, ад якога пайшла потым назва рэчкі Зашкавец і назва самога мястэчка.

Першае ж упамінаньне аб Заскевічах, як аб вёсцы датуецца 1568 годам.

*З крыніц вынікае што*: ***«Жыгімонт Аўгуст у 1568 годзе надаў дванаццаць валок заселенных ў сяле Заскевічы (Zaskiewicze) і тры незаселяныя валокі ў сяле Ходкевічы (Chodkiewicze), выдзеленыя з Маркаўскага староства Федару Язманаву, арандатару «мейшагольскаму».*** *(*3)

Здаецца, што маглі знайсьці людзі пасярод балот у Маркаўскай пушчы? Але ж лясы гэтыя кармілі мястэчка пачынаючы з 1525 года, калі Жыгімонт Аўгуст назначыў мыта--значыцца, добры гандаль ішоў.

***...на Велі, на перевозе Марковском к двору нашому Марковскому брал от каждого плоту. от дров-по дванадцаті пенезей, а от дерева,***

***што на будаваньe-по шесті грошей…**(4)*

Самае цікавае тут тое, што найбліжэйшая адлегласьць ад Маркава да Вільлі--10 кілямэтраў, і ляжыць гэты адрэзак ля Заскевічаў, якія пэўны час, па 1568г., былі ўскраінай Маркаўскага староства. Хутчэй за ўсё, гэтак званы Маркаўскі перавоз быў Заскевіцкім, толькі назва *Заскевіцкі* прыйшла пазьней, з ростам і пашырэньнем вёскі. А ў такім дакуменце, як "Устава на валокі" 1557 года, дзе Жыгімонт Аўгуст зацьверджае для сялян маркаўскага староства, у тым ліку і заскеўскіх новую павіннасьць; спускаць драўніну, няма ніводнай згадкі пра Маркаўскі перавоз.

***…на спушчене дерева с пушчы Марковское всі подданые нашое волості тамошнее мают быті на тяглую службу постановена…**(5)*

І ў прывілеі Яна Казіміра 1666 году на маставы збор упамінаецца, што камісія аглядала пераправу ў Заскевічах.

Сплаў дрэва быў доўгі час--аж па другую чвэрць XX стагодзьдзя, ці не найважнейшым заняткам месьтачкоўцаў. Да таго ж шлях, дзе стаяла мястэчка, заўсёды ажыўлены, што і паскарала як эканамічны, так і дэмаграфічны рост паселішча.

*<u>У сваім прывілеі кароль Ян Казімір пісаў</u>*:

***«…вёска Заскевічы ляжыць…на вялікім шляху зь Менска на Залесьсе, Вільню і іншыя месты і мястэчкі…**(3)»*



Подпіс Яна Казіміра

Але кароль не пазначыў, што шлях праз Заскевічы найкарацейшы, бо ідзе ён вадою--па Вільлі, зьяўляючыся адгалінаваньнем ад старажытнага шляху Менск-Вільня, які ляжаў на прамежку Лебядзева-Маркава-Беніца. Гэтай выгады ня мог не заўважыць Самуэль Геранім Кацёл, уладальнік мястэчка, і ўжо ў 1666 годзе атрымаў каралеўскі прывілей на маставы збор. Дзякуючы прывілею, цераз Вільлю быў збудаваны мост і прызначана мыта. Мястэчка прагрэсавала! З таго часу яно злучала наземныя і водны шляхі, левы і правы берагі Вільлі. Да таго ж, суседні горад--Маладэчна, на працягу XVII ст. быў адным з дваццаці найбуйнейшых ў дзяржаве гарадоў, што, натуральна, і ўплывала на разьвіцьцё рэгіёна.

Пазьней тут ужо меўся паштовы гасьцінец, уніяцкая царква, карчма, вадзяны млын, тутэйшыя габрэі пабудавалі сабе сінагогу...

У XVIII ст. Заскевічы стаялі на адным з трох найважнейшых у дзяржаве шляхоў--«Вільня-Менск-Магілеў-Масква», і займалі адно з найпершых мейсц на Вільлі па сплаве дрэва. Пазьней, у 1871 годзе, аб гэтым будзе пісаць *К. Тышкевіч*.

***«непадалек ад мястэчка ёсьць прыстань Заскевічы, вядомая сваім гандлем па Вільлі, да шпіхлерзаў той прыстані звозяць фуры з Маларосії** (Украіны)**, Русі Белай. З акалічных лясоў на берагі Ушы звозяць пяньку, драўніну, адкуль сплаўляюць па Вільлі...***(6)»

Аб тэрытарыяльным росьце Заскевічаў сьведчыць і тое, што паселішча ўмоўна падзялялася на тры часткі: фальварак, мястэчка, вёска. Паступова гэтыя часткі пачалі набываць некаторыя своеасаблівасьці. Напрыклад: у фальварку жылі пераважна каталікі, у мястэчку--габрэі, у вёсцы--праваслаўныя і уніяты. Ад мястэчка, паралельна *Вёсцы*, цераз рэчку, пачынала расьці новая, вуліца што мела назву Крэўская. Вуліца пераходзіла ў палявую дарогу на Крэўскі пераезд *(гэта быў самы першы чыгуначны пераезд у Заскевічах, яго зьменяць з-за нязручнасьці немцы на новы, пабудаваўшы цяперашні)*, праз які езьдзілі ў Крэва на кірмашы 9 траўня і 2 кастрычніка што-небудзь купіць, а пазьней і прадаваць кахлю, лён.

Адметнай і своеасаблівай часткай зьяўляўся цяперашні засьценак Шыкава, які напачатку сваёй гісторыі быў пасяленьнем ссыльных вязьняў, што на сваіх плячах цягалі лес, пілавалі яго, сплаўлялі...(8) Аб мінулым цяперашняга засьценка можна здагадацца зусім неспадзявана: калі Вы, не зусім добра ўмеючы, сядзеце гуляць у дурня зь кім-небудзь зь мясцовых- Вам дадуць параду пайсьці ў Шыкава да камянёў, што ляжаць ля Ушы,-- там навучаць.

Прысутнасьць у мястэчку габрэяў і шматканфесійнасць заўсёды добра ўплывалі на ўмацаваньне самасьвядомасьці, захаваньне традыцыяў, актывізацыю грамадзка-палітычнага жыцьця--яно ва ўсе часы віравала ў Ашмянскім павеце. Варта толькі прыгадаць паўстаньне 1793-1794 г.г., фармаваньне атрадаў паўстанцаў на чале з князем М.К. Агінскім; вайну 1812 г., у якой род Катлоў, уладальнікаў Заскевічаў, прымаў удзел на баку Напалеона з марай аб аднаўленьні ВКЛ; паўстаньні 1830-1831г.г., што мела добры водгук у Ашмянах, спроба падняць на паўстаньне сялян пад Смургонямі ў 1848 годзе Бакштанскім, паўстаньне 1863-1864 гадоў. Дзеі паўстаньняў адбываліся на гэтай зямлі, бо інсургенты, дзякуючы цяжкапраходнасьці для карных войскаў, доўга канцэнтраваліся ўздоўж Вільлі, на адрэзку ад вусьця Нарачанкі да Ушы... Не маглі ня ўдзельнічаць мясцовыя рабочыя, моладзь, прадпрымальнікі і ў ашмянскіх і смаргонскіх маёўках рабочых, забастоўках гарбароў 1896 года, дзейнасьці БСГ., «Зялёнага дуба», камандваньне якога на чале з атаманам Дзергачом працяглы час месьцілася ў Маладэчне. З пачаткам Першай сусьветнай вайны і акупацыяй Маладэчаншчыны й Смургоншчыны кайзераўскімі войскамі ў лютым-сакавіку 1918 года ў Міхневічах, Яневічах, Алянцы, а ў кастрычніку і ў Заскевічах зьявілася падпольле (у далейшым яму налепяць цэтлік-Ашмянскае камуністычнае падпольле). Змагары вялі даволі плённую барацьбу: імі ўзарваны склад боепрыпасаў ля чыгункі ў Прудах, спынены цягнік з нарабаваным ў Залесьсі. Перастала падпольле дзейнічаць з адыходам Заходняй Беларусі пад уладу Польшы.

За часамі Другой Рэчы Паспалітай былі й станоўчыя зрухі; былая царская школа стала чатырохклясавай беларускай, пабудавалі больніцу, другі млын, «млякарню», працавала мануфактура Гільмана па вырабу кахлі...

Эканамічнае становішча ў краіне была шчыльна зьвязаная зь мястэчкам; маленькім прамыслова-рамесьніцкі цэнтрам усей акругі. Мелася тут і свая асаблівасьць: рамяством і часамі й гандлем займаліся местачкоўцы-беларусы, на раўне з габрэямі. І даволі плённа, бо сваім жыцьцёвым укладам зьдзівілі не аднаго гандляра ці падарожніка.

***„Усё падаецца такім голым і абшарпаным…без дрэў і урадлівай зямлі...Які вецер закінуў, якая патрэба была сяліцца тут?... Але яны не толькі забясьпечылі свае патрэбы, але і заквітнелі промыслам і гандлем. Рэч загадкавая...»****(6)*

*К. Тышкевіч*



Заскевіцкая школа 1949 год

За васямнаццаць гадоў (1921-1939) кожны руплівы гаспадар здолеў стаць «сапраўдным панам сахі й касы». У вялікай колькасьці людзі скуплівалі панскія сенажаці, балоты, лясы. Некаторыя гаспадары куплялі зямлю за шэсьць-сем кілямэтраў ад Заскевіч. Можна ўявіць, якім рабаўніцтвам абярнулася б калектывізацыя. Бяднейшыя ж верылі агітатарам і выпраўляліся ў Расею шукаць лепшага жыцьця. Вярнуліся адтуль толькі адзінкі...

1939 год стаў пераломным ў гісторыі Заскевічаў. З прыходам “першых саветаў”, а за тым і пачаткам вайны мястэчка паступова пераўтваралася ў вёску, зьнікаў былы лад жыцьця: на зьмену якому--прыходзіў тэрор. Першым новыя законы спазнаў мясцовы солтас Кохан Сяргей, якога адразу арыштавалі і саслалі ў Гулаг. Па указе “зь верху” 12 кастрычніка 1940 г. маладзечанскі раён падзялілі на сельсаветы, сярод якіх і заскевіцкі. За сельсаветамі “прыйшлі”перадзелы зямлі, сваркі, пераконваньні ў выгадзе калгаснага ладу жыцьця. Бяда адна не ходзіць: на зьмену аднаму «парадку» прыйшоў другі.

Не было ні баёў, ні гераічных подзьвігаў савецкіх салдат--было адступленьне, больш падобнае на ўцёкі (кідалі зброю ў лясах, танкі й машыны тапілі ў Ушы, Вільлі, апраўдваючыся складанай пераправай).

Адступленьне Чырвонай Арміі і невялікая перастрэлка, як сьлед, пакінулі прастрэлены куляй ў царкве абраз Божай Маці.

Першымі жахі вайны зьведалі габрэі. Старыя былі адразу сабраныя ў гета і растраляныя ў выкапанай самімі ж яме на габрэйскіх могілках, а моладзі прапанавалі адкупіцца золатам, пасьля чаго паразвозілі каго ў маладэчанскі лягер, каго ў Лебедзева, а каго й спалілі. Амаль такі ж лёс мог чакаць усіх жыхароў мястэчка, але страшнае мінавала. Аднаго разу немцы ўбачылі, як з зямлянак, збудаваных у гародах, выходзілі людзі пасьля чарговага бамбаваньня рускімі, і, прыняўшы іх за партызанаў, павялі амаль усіх расстрэльваць на могілкі. Добра, што адзін з немцаў ведаў польскую мову, яму і растлумачылі, у чым справа.

З аднаго боку, ля чыгуначнага маста, ля Заскевічаў былі "Штыпцпункт" і бункер, з другога, ля «барка»,--казармы й склады, у якіх мясьціўся атрад самаахові, дзякуючы якому нікога з беларусаў не растралялі і не вывезьлі ў Нямеччыну. Заскевіцкая школа не працавала: там жылі салдаты, а мясцовая дзятва навучалася ў Хатуцічах ці ў хаце Мялюка ў Шыкаве.Жыцьцё не спынялася, мястэчка выконвала такія ж функцыі, як і раней: шлях, шлях праз які з захаду на ўсход, з усходу на захад ішлі абозы, салдаты, машыны...Своеасаблівым выдаўся й канец вайны, калі савецкія лётчыцы віншавалі жыхароў мястэчка са сьвятам 8 сакавіка. Замест таго каб зьнішчаць ваенныя склады й казармы, зьнішчалі суседні засьценак Шыкава. Памыліліся...

Па сканчэньні вайны людзі, не пасьпеўшы аднавіць гаспадарку, ішлі ў калгас, туды ж адышлі лепшыя землі. Кожная вёска мела свой калгас, пакуль у 1953 годзе не аб'ядналіся ў адзіны вялікі калгас «Сьветлы шлях». Такой жудаснай калектывізацыі, як ва Усходняй Беларусі, людзі ня зьведалі: мець каня і карову--гэта норма, астатняе--дзяржаве. Усе пустуючыя будынкі разьбіраліся на бярвеньне, у першую чаргу бажніцы ў Заскевічах, Годкевічах, Вяжуцях, сядзібы засьцянковай шляхты зь якіх затым ў Канчаньні (тап.) будавалі калгасныя гумны, хлявы.Праца ў калгасе абавязковая і прымусовая для кожнага. Зьбіраліся брыгады маладых хлапцоў ("ахараўцаў", як іх называлі местачкоўцы), жанчын і мужчын, якія для падтрымкі калгаса капалі ў ручную возера (рыбнік), дзе разводзілі на продаж рыбу.

На пачатку 60-х пабудавалі новы завулак, школу, клюб, краму, кантору, дзіцячы садок, пошту, дом быта, лазьню, амбулаторыю.



Архараўцы

Ужо на канцы 70-х калгас—гэта сьветлы прыклад сацыялізму, які мае за гонар запрасіць такіх вялікіх гасьцей, як Петар Машэраў, Кавалёнак. Гэтымі ўспамінамі жывуць і да цяперашняга часу.

Лёс склаўся так, што ўсе гістарычныя, культурныя, нават геаграфічныя адметнасьці, якія афармляліся не адно стагодзьдзе, зьніклі за некалькі дзесяцігодзьдзяў савецкай улады. А мястэчка ж разьвівалася не паўторна, адчуваючы ўплыў усіх канфесіяў, прадспаўнікі якіх пражывалі на тэрыторыі дзяржавы. Нават і прасторавае яго разьмяшчэньне было адрозным: паселішча пачынала расьці з вуліцы, збудаванай з аднаго боку, а потым забудова зьявілася на другім баку і арыентавалася на дарогу, а не на раку, як усюль.. Да першай вуліцы *(Места)* перпендыкулярна далучалася другая вуліца-*(Вёска)*, упоперак ім ішлі надзелы зямлі. У цэнтры мястэчка, на шырокай плошчы ля ўскрайку дарогі, стаяла карчма, сінагога, кафляны завод. Традыцыя цэнтралізацыі вакол гасцінца працягвалася і за савецкім часам, пакуль новапабудаваны завулак Школьны не пераняў ініцыятыву цэнтралізаваць вакол сябе. Уздоўж ракі месьціліся кузьні, млын, «млякарня», трапальня і пральня льну. Даволі адметнымі і экзатычнымі былі тапонімы. Першыя зь іх згадвае <u>*К. Тышкевіч:*</u>***"За Заскевіцкай***



Працоўныя мануфактуры

***прыстаньню...паварот пад назвай Варабьевы норы*** *(Wierebjowy-nort)*, ***за ім яшчэ адно прыгожае месца-Ардзейская паласа*** *(Ordziejska-plosa)*...***Бярозаўка*** *(Bierezowka)*, ***прыстань ў Заскевічах...”****(7)*

Сярод сучасных тапонімаў іх ужо няма. На месцы былой пристані-лецішчы, фальварак завуць *Паддубком* або *Сапачамі*, мястэчка і вёска засталіся тымі ж. Тое мейсца, дзе вёска выходзіць да чыгункі, называлі *Канчаньне*. Яно дзеліцца рэчкай на дзьве часткі, разьдзеленныя паміж сабой--*Гайкі і Асяродак*. *Гайкі* аддзеленыя ад вёскі *Валокай*, а ў бок Алянца, уздоўж чыгункі,--*Запунцішча*. На той бок чыгункі, дзе раней пасьвілі кароў,--*Падвыгонак або Падвыгонка*. Далей, на паўночным захадзе, дзе былі сенажаці--*Анісаўка*, бліжэй да маста--*Трулесіна*. У кірунку Конанавічаў, за кілямэтар ад вёскі,--*Завыганьне, Лучынава, Мецева*, далей *Падваўком (зараз Пад Ганчарыкам)*. Сучасны завулак Школьны, калісьці багаты на розную дзічыну,--*Ліпнік*, крыху ў бок гасьцінца--*Жыдоўсі ліпнік*. Шмат тапонімаў звязана зь месцамі, якія апрацоўвалі людзі--*Чвэрткі (на месцы першага калгаснага стана), Шырокія (надзелы па два загоны на месцы сучаснай школы й клюба), Сядзібныя шнуры або Царкоўныя (на усходні захад ад вёскі), Шнур*. Як напамін аб колішняй мануфактуры, кахлю зь якой везьлі ў

Крэва, на кірмаш,--*Крэўская вуліца, зараз Зарэчная*. Былыя габрэйскія хаты захавалі назвы сваіх уладароў: *Гільманаў дом і Клюдава хата.*

Зараз гэтыя назвы зьніклі, засталіся хіба ва ўспамінах. Не прыжыліся тут і тапонімы савецкага часу: вуліца Калхозная, Савецкая. Цікава зьмянялася назва ракі: у прывілеі Яна Казіміра 1666 года яна называецца ***Зашковец***, чым і абвяргаецца легенда аб паходжанні назвы ад карчмы, у "Slowniku geograficznym" 1895 года--*Белічанка*, што больш падобна на сучасную назву-*Бенічанка.(9)* Другой па значнасьці стратаю можна лічыць зьнішчэньне былога каларыту; старых будынкаў, чаго толькі вартая сінагога--"зьліцьцё ў архітэктуры габрэйскай і беларускай культуры, пераасэнсаваны вобраз жытла, каўчэга..."

Чаму так здарылася?

З усіх сем'яў местачкоўцаў якія жылі тут у 20-30-я гады засталіся нашчадкі пяці-шасьці сем'яў, усе астатнія прыехалі, пераважна ў пасьляваенны час. Таму і адсутнічае перадача гісторыка-культурнай памяці ад пакаленьня да пакаленьня. А з апошнімі сьведкамі мінулага зьнікае сувязь, якая злучала стагодзьдзі, і абрываецца на нас...

І цяпер хіба толькі ва ўспамінах і мроях можна вярнуцца ў апошні год былога жыцьця--ў пераломны 1939-ы...

Прайсьціся ранкам, на трэці дзень Вялікдня, яшчэ перад фэстам, па старанна вымеценых брукаваных вулачках, сярод бялюткіх, павапнаваных цагляных і драўляных хатаў. У дварох якіх ужо стаяць калёсы сваякоў з Беніцы, Сівіцы, Хатуціч. Парасчыняныя вокны, адкуль даносіцца гамонка гаспадыняў, на лаўках сядзяць мужыкі, дзеці яшчэ ў школе. Туды й кіруюся--да старой, яшчэ з царскіх часоў школы. Там праз старую шыбу можна пабачыць з паўтузіна дзяцей.

Сёньня дзеці прыгожа апранутыя, сядзяць паслухмяна склаўшы рукі за сталом і моляцца, пaглядаючы то на настаўніка, то на каталіцкі крыж што вісіць над дзьвярыма :

***Duchu swienty***
***Curek oswientych zbawliennia***
***Aby nauka bede nam powszechnych...***

Гэтую малітву, пачутую з-за шыбы ўжо перабівае шум калёсаў на мосьце. Першыя гандляры сьпяшаюцца заняць месца ля царквы. Трэ й туды пасьпець. Зайсьці да Эські, купіць духмянага пірага, затым у карчме прысесьці з куфлем сьвежага, толькі прывезенага з Беніцкага бровара піва, пагаманіць з плытагонамі, паслухаць дзе што робіцца, або проста

памаўчаць. Лепш памаўчаць. Хто ж зь іх ведае, што стане зь імі потым, як павернецца іх лёс у гэты небясьпечны, віхурысты час. Ды вось хаця б гэтыя дзяды; Мікіта й Васіль, што сядзяць леваруч:--праз колькі месяцаў яны будуць вітаць "вызваліцеляў" крыкамі:"Няхай жыве чырвоная красная армія!" Ці Сяргей (солтас), што зараз завіхаецца ля дзяўчат,--хутка пазнае Гулаг і ніколі ўжо ня вернецца да дому, або тая кабета, жонка Лейбкі-трапальшчыка, што зь дзьвюма дачкамі падыходзіць да калёс Смургонскага гандляра, набывае па жменьцы цукерак, "лёды" й пернікі—апошні раз іх таксама ўбачаць разам, ўжо забітымі немцамі. Дзьве яе дачкі,будуць ляжаць накрытыя целам маці,--нібы хацела зьберагчы…

Балюча, балюча гэта бачыць і разумець. Хутка ўсё згіне. І ўжо ня будзе круціць вада старыя драўляныя колы млыноў, браты Васіль і Аляксей Асіповічы ужо ня будуць зьбіраць плыты на Вільлі, ля каменнага забора *Прывітаньне,* і кідаць у ваду лусту хлеба са словамі: "Вітаю цябе хлебам-сольлю, хлеб-соль прымі і мяне прапусьці", ня будзе чутна празь Вільлю гуканьне:" Чарапай*, падай порам!"…

---

У параўнаньні зь іншымі населенымі пунктамі мястэчка, яшчэ жыве: адбудаваная царква, працуюць: рэстарацыя, кавярня, музычная школа, на прыватнай ініцыятыве трымаецца дом культуры. Пэрспэктывы? Я праведу паралель: Беларусь--цэнтар Эўропы, перасячэньне транзітных шляхоў. Багатая, але забытая спадчына... Адказ адзін--патрэбны Гаспадар.

Мне пашэнціла нарадзіцца тут. Няхай усё забыта, нічога не засталося ад былога... Я зажмурваю вочы на калгас, шэрасьць завулка, бруд. Уяўляю сабе Жаскевічаў; першых плытагонаў; што назначаў мыта; Жыгімонта Аўгуста; Яна Казіміра, які надаў прывілей; Агінскага, атрады паўстанцаў; Напалеона; усіх уладароў Заскевічаў, сярод якіх быў і Леў Сапега; тутэйшую шляхту; мястэчка, якім яно бышо даўней...

Забыўшыся аб усім, уваскрашаю мінулае з павольным, бы тая Вільля, жыцьцём, у параўнаньні зь якім Менск здаецца нейкім незразумелым. Я ня маю тут *(у Менску)* сувязі зь мінулым, таму не магу тут уваскрашаць.

---

*Чарапай--уладальнік парома на Вільлі.

## Уладары мястэчка

*Да 1476 дзяржаўныя уладаньні ВКЛ*

***Олехн Санькговіч*** *з1476*

*Да1568 дзяржаўныя уладаньні ВКЛ*



Leliwa



Łabędź

***Фёдар Язманаў*** *з1568*

***Сташкевіч*** *(Герб Leliwa)*

***Валадкевіч*** *(Герб Labedz)*

***Леў Сапега*** *з 1590-1646*

***Бац*** *1646-1665*

***Катлы*** *1665-1813 (Герб Pielikan)*

***Самуэль Геранім***

***Міхал Казімер***

***Габрыэль***

***Казімер***

***Тадэуш***

***Міхал Казімер***

***Барбара***

***Швыкоўскія*** *1812-1939 (Герб Ogonczyk)*



Ogończyk



Pelikan

*(Невялікія зямельныя ўладаньні ў Заскевічах мелі* ***Агінскія****)*

## Найбольш разпаўсюджаныя прозьвішчы местачкоўцаў у 20-30-я гады

*Асіповіч*
*Баран*
*Бабей*
*Бабёр*
*Васілеўскі*
*Гарбачэўскі*
*Даўбенька*
*Кашэль*
*Сьвірыда*
*Кохан*
*Мялюк*
*Руткоўскі*
*Савіч*
*Сарока*

**Па занятках**

Токары

*Эпіфан*
*Сьцёпка Баран*
*Руткоўскі*

Кавалі

*Сымон Вяль*
*Кохан Іван*
*Монід*

Працоўныя мануфактуры

*Дудко Алімпіяда*
*Соня Сарока*
*Гарбачэўскія Вольгі*
*Канапацкі*
*Мілка Бабей*
*Дзевянцей Марыя*
*Прадавы Волька і Манька*

Заможныя сяляне

*Мялюк*
*Руткоўскі*
*Бабёр*

Беднякі

*Кохан*
*Космач*
*Руткоўскі Лявон*

Апошні уладар парома

*Чарапай*

Апошні мельнік

*Мялюк Міхась*

Апошнія плытагоны

*Браты Аляксандар і Васіль Асіповічы*

**<u>Гады Другой сусьветнай вайны</u>**

Солтас

*Кохан Сяргей*

Паліцаі

*Баран Юрка*
*Юзя*

Участковыя

*Лагуновіч*

**<u>Пасьляваенны час</u>**

Першыя старшыні калгаса

*Сьцяпан Сарока*
*Дзёмка Асіповіч*
*„Гераініха”*
*Чаркасаў (прыезжы)*
*Калачык (прыезжы)*

## 1. Легенда ў апрацоўцы Гарэлік Ліліі Ціханаўны

### Адкуль у вёскі назва

*Па бальшаку з Маладэчна*
*Ў горад Вільню ў час вясны*
*Едзе хлопец маладзенькі,*
*А завуць яго--Васіль.*
*Коні скачуць шпарка, жыва,*
*Уздоўж мільгае лес, палі...*
*Эх, раздольле! Люба-міла*
*Жыць калі шчэ малады!*
*Глядзь--карчма каля дарогі,*
*І праезджыя гуляюць.*
*"Хай у коней спачнуць ногі",-*
*Так падумаў і зьлязае*
*Хлопец з брычкі...*
*У карчомку заглядае.*
*-Добры дзень у хату,-кажа*
*І паклоны адбівае.*
*Але ніхто не страчае.*
*-Дык хто ж мяне прывітае?!-*
*Зноў спытаўся, сеў на лаўку:*
*Як-ніяк, ўсё ж прытаміўся.*
*У гэты час з бакоўкі шпарка*
*Сам карчмар прад ім зьявіўся:*
*-Выбачайце за затрымку,*
*Бо няпраўка:--жонка хвора.*
*Хочаш есьці? Выпіць? Можа,*
*Адпачыць? Паспаць часінку?*
*-Я б ня супраць. Месца дбайна:*
*Луг і рэчка, і лес побач*
*І зямля тут ураджайна,*
*Толькі б людзям Бог у помач!*
*Дзеду хлопец спадабаўся:*
*Хватку мае гаспадарску*
*Ды й прыгожы.*

*Заўсьміхаўся тут карчмар*
*"Зрабі мне ласку, падарожны*
*Як няцяжка, то* ***заскоч*** *ў адну хаціну,*
*Што вунь там, за карчмой, побач,*
*І пакліч маю дзяўчыну,*
*Каб прыбегла мне на помач".*
*"Што ж цяжкога? Калі ласка!*
*Хлопец рады, пасьпяшаўся",--*
*Хутка ў хату да Параскі*
*Ён з парогу прывітаўся.*
*Хаціна хоць не вяліка,*
*Але чыста ўсё, прыбрана,*
*Кругом кветкі і фіранкі,*
*Ручнікі павышываны.*
*"Знаць, гаспадынька тут рупліва"--,*
*падумаў госць. І тут: о дзіва!*
*Зь сьвятліцы выбегла Параска!*
*Мой Божа! Гэта ж сама краска!*
*"Што вы хацелі?"-запытала.*
*А хлопцу ледзь не дрэнна стала,*
*Бо моцна-моцна сэрца бьецца*
*І што рабіць?Куды падзецца?*
*У вочы глянуў--утапіўся*
*Нібы ў бяздоньне праваліўся.*
*А косы, вочы, стан дзявочы--*
*Нат нельга ў бок адвесьці вочы.*
*"Мяне карчмар прасіў сказаць,*
*Каб яму йшла дапамагаць..."*
*Сказаў так хутка, павярнуўся,*
*Але праз парог спатыкнуўся,*
*"Прыкмета добрая! Глядзі!*
*Ты гэту краску не ўпусьці!"-*
*Як нехта шэпча яму ў вуха.*
*Тут не патрэбна медавуха-*
*Галава кругам, сэрца бьецца:*
*Параскай дзеўчына завецца!*
*Дзе я ні быў, такой ня бачыў,*
*І каб да сэрца так прыйшлася*
*А сэрца шэпча:"Заставайся,*

*Браток, у Вільню не сьпяшайся!*
*Ноч вельмі хутка праляцела.*
*Ўжо трэба ехаць, але дзе там!*
*Васіль з Параскай побач ходзіць*
*Работа складна ў іх выходзіць.*
*Стары жартуе:"неспадзеўкі-*
*Ледзь не засватана ўжо дзеўка!"*
*Не памыліўся, хутка вельмі*
*Дачцэ сяброўкі вэлюм зьвілі*
*Васіль жартуе :" на часінку з каня*
*Скочыў у карчму* ***заскочыў****-*
*Ўжо збудаваў сабе хаціну,*
*З старой у нову пераскочыў!*

*Давай Параска, месца гэта,*
*Дзе нарадзіла ты мне дзетак,*
*Заскавічамі клікаць будзем,*
*Хай стане ўсё вядома людзям.*

*Ды і да шлюбу пабраліся!*
*А праз гады тут вёска стала--*
*Карчма даўно ўжо прапала.*
*У Заскавічах адмысловых*
*Жывуць нашчадкі Васілёвы:*
*Прагожы тварам, працавіты,*
*Душою чысты, несярдзіты,*
*Гасьцінны, дружны і вясёлы...*
*Пра іх так кажуць ўсе наўкола.*
*Ну а дзяўчаты, нібы краскі,*
*Усе як некалі Параска,*
*Ды й гаспадыні, што сказаць--*
*У цэлым сьвеце не сыскаць!*

2. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага.

3. Жыгімонт Аўгуст ў 1568 г. надаў 12 валок, заселяных у сяле Заскевічы і 3 валокі пустыя ў сяле Ходкевічы, выдзеленых з маркаўскага староства, Фёдару Язманаву, арандатару мейшагольскаму. Па сьмерці Езмана перайшлі тыя землі на Сташкевічаў і Валадкевічаў, ад якіх набыў іх у 1590 канцлер Леў Сапега, і аддаў у 1646 г. пажыцьцёва Базылему Бацу, падчашаму троцкаму. У 1665 годзе Павал Сапега дараваў іх Самуэлу Коцелу (Павал Ян Сапега--ваявода віленскі, гетман вялікага княства Літоўскага, борцяньскі, ростаўскі, зьдзітаўскі і інш. стараста. Чынам высокім і зазнаны тым лістом дабравольным, вечным запісам сваім, што ва ўласным распараджэньні сваім вышэй названыя Заскевічы і Ходкевічы ў павеце ашмянскім ляжачыя, праву вечнаму падлягаючы, натойчас ўладаньні яснавяльможнага пана Базылега Бакі, падчашага троцкага, будучы кампенсаваць аказаўшы добрую і зычлівую для мяне прыязьні пана Самуэла Гераніма Коцела, пісара скарбовага ВКЛ, ваяводы старадубскага, а хочучы і ў час прысланы неадменнай ягамосьці захацець сабе зычлівасьці, вечнасьць вышэй названых (Заскевічы і Ходкевічы)...з падданымі на той час ў іх складзе і разасланымі (па справах сялянамі-Л.С.), зь землямі, лясамі, барамі, гаямі, сенажацямі, рэкамі і рэчкамі і г. д., дае, даруе, і тым лістом, дабравольным запісам маім на вечныя часы запісвае...праз генерала ў вечнасьць тое аддае. Вольны будзе пан Кацёл, пісар скарбовы ВКЛ, тыя вёскі Заскевічы і Ходкевічы ад яснвяльможнага пана Бакі, падчашага троцкага забраўшы, так імі як уласна вечнасьць свая ёсьць, можа каму заўгодна даць, дараваць, прадаць запісаць, паводле сваёй волі і найлепшага ўпадабаньня распараджацца і т. д.Пісаны ў Варшаве дня 7 месяца Студзеня года1665.(Арыгінал у Беніцы)

Кароль Ян Казімір дае прывілей Коцелу на маставы збор у Заскевічах, вызначыўшы ў красавіку 1666 года камісію для агляду той пераправы праз рэчку...даў нам права народжаны Самуэл Геранім Коцел, пісар скарбовы, ваявода старадубскі ВКЛ, з-пад вёскі яго, названай Заскевічы ў павеце Ашмянскім ляжачы на гасьцінцу вялікім з Менска на Залесьсе да Вільні і іншых мест і мястэчак ідучых, на рэчцы Зашкаўцы (Zaszkowce), цяжкі і вельмі складаны пераезд. Людзі падарожныя для той пераправы вялікія шкоды церпяць--камісія на месцы ў чвэрці ўспомненага года вызначыла мыта за праезд па збудаваным Коцелам масьце: ад кожнага ваза аднаконнага людзей

купецкіх, габрэйскіх і фурманоў па паўтара гроша, а ад быдла рагатага,па масьце вядучага,-па адным шэлегу. Аднак стану духоўнага і шляхецкага, а таксама іх вазы, вярхом едучы ці пешу ідучы, маюць быць вольнымі ад таго мыта (Прывілей за подпісам караля, даны ў Варшаве 19 чэрвеня 1666..)

А Ян князю Чартарыйскаму...выгадна з ім некаторых зямель Заскаўскіх замену ўчыніў.

Чэслаў Янкоўскі „Павет Ашмянскі"

4 Letuvos metrika #4 **О бра*н*(ь)е мыта *от* плото*в* на реце Велі на перевозе Ма*р*ковско*м*.** Жыкгімо*нт*, Бо*ж*ю м(і)л(ос)тью коро*л*. Подчашому нашому, де*р(*жавце) васі*л*(ішскому) і ма*р(*ковскому),

п(а)ну Яну Міколаевічу (Радівіловіча). Што есі перед намі, іж многіе мыта новые: князскіе і панскіе, дворанскіе, боярскіе, по реці Велі сталі ўверх места Вілен(ь)ского, і колі-кольвек плоты нашi с пушчі н(а)шое Марковское ку потребе нашое до Віл(ь)ні спушчаешь, іно от тых плотов мало мыта выходіть, за што плоты стоять. А просто, кгды ж ся реч так в собе маеть, пріказуем тобе ажбы есі тэж мыто от плотов на нас, г(оспо)д(а)ра, на рэці, на Велі, на перевозе Марковском к двору н(а)шому Марковскому брал от каждого плоту, от дров-по дванадцаті пенезей, а от дерева, што на будаван(ь)е--по шесті грошей пісан ў Кракаве под лет(ы) 1525год, м(еся)ца мая 29.ден(ь), індік(т) 13. В том лісте рука королевская есть. Горностай, пісарь.

5

Літоўская метрыка (Артыкул) #36. Естьлі бы подданые за росказан(ь)ем нашым лістовным камен(ь)е возілі, тогды ім за то в цыншох фолкга маеть быті вделана водле змешкан(ь)я іх на те послузе нашой. А на спушченье дерева с пушчы Марковское всі подданые нашое волості тамошнее мают быті на тяглую службу постановена так, яко Волыніцкіе, которые за дні, ім повінные, дерево і дрова спушчаті до Вільні будут повінныя а где бы тая волость водле потребы нашое тому досыть вчыніті не могла, мають быті на то отлучоны люді от одного альбо двух дворов нашых, которые так же на тяглую службу постановіті і ку той службе с потребу іх прывернуті.

6

...На левым беразе ракі здалечыні сьвеціцца залацістая прыстань, на ёй як-бы чорныя плямы сплесьнелых саламяных дахаў, у якімсьці парадку стаяць. Пасярод тых будынкаў вымалёўваецца постаць апушчанай царквы з блішчастай вежачкай і запалым, месцамі, дахам. Гэта мястэчка Заскевічы, недалек ад берагу Вільлі, пры тракце паштовым, на пясчанай прыстані ляжачая, такая голая;

якаясь абшарпаная, так смутна і панура, без дрэў і зеляніны, што глядзець на яе брыдка. З чаго паўстала патрэба
залажыць ў тым месцы мястэчка, якая патрэба была сяліцца тут, як людзі аседлі на голым тым пяску, як-бы на афрыканскай пустыні?...Але яны не толькі забясьпечылі свае патрэбы, але і заквітнелі промысламі і гандлем, то сапраўды рэч загадкавая; досыць таго, што людзі жывуць тут здаўна, і з голаду не паміралі; а малая рэчка Уша, што плыве да Вільлі, па тый пясчыстай прыстані, то ім ваду дае, а вясной, пры падняцьці першых вод, і тавар лясны на сваіх хвалях перавозе. Павет ашмянскі з вілейскім тут мяжуе... За вусьцем Ушы, недалёка ад упамянутага мястэчка, ёсьць прыстань Заскевічы. Тая прыстань вядомая сваім гандлем па Вільлі. Фуры з Маларосіі, Русі Белай цэлую зіму навозяць да шпіхлерзаў той прыстані, а таксама пяньку, і драўніну з ваколічных лясоў на берагі звозяць і па рэчцы Ушы сплаўляюць. У той час як мы там былі, рух быў дужы на рэчцы, скрынкі зь пянькой і семем, вязаныя плыты драўніны, якімі рэчка была запоўнена.

За заскевіцкай прыстаньню Вільля крыху прыгажэйшая, праходзілі цераз адзін ейны паварот, вядомы пад назвай Верабьёвы норы, за імі яшчэ адно места-Ардзейская паласа...

**К. Тышкевіч Вілія і яе берагі с.79-80**

7 Распавёў Зуй Аляксандар

**8** **Заскевіцкі перавоз-**фальварак на левым беразе Вільлі, павет ашмянскі, ў другой акрузе адміністрацыйнай, ў 44 вярстах ад Ашмян, 2 дамы, 11 жыхароў-каталікоў.

**Заскевічы1)** мястэчка на левым беразе Ушы, у 2 вярстах ад яе вусьця да Вільлі, пав. ашмян., на памежжы пав. вілейскага, ў 2-ой акрузе адміністрац., беніцкая гміна, акруга вясковая, Заскеўская, ў 52 в. ад Ашмян, а 128 в. ад Вільні, 31 дом, 212 жыхароў (40 проаваслаўных, 14 каталікоў,158 іудэяў), капліца праваслаўная, габрэйская школа, водны драўляны млын. Паводле дадзеных з 1881 было тут 362 чалавекі (187 мужчын,175 кабет). Уласнасць Швыкоўскіх. У склад вясковай акругі ўваходзяць: Годкавічы, Яневічы, Конанавічы, Турэц, Заскевічы, да таго засьценкі: Амелін, Добржын, Каралевіцы, у агуле ў 1865 годзе 275 душ рэвізіі вольных і 61 б. скарбовых **2) З.**вёска на рэчцы Бенічанка, ў 1 в. ад мястэчка, 14 дамоў, 222 жыхары (141 праваслаўных, 81 католік). Паводле сьпісу1865 было 47 душ, належачых да дабра

Беніцы, Швыкоўскіх, 12 да дабра Залесьсе, кн.Агінскага.

9

Цікава, што людзі перакананыя ў тым, што Бенічанка цячэ з Беніцы. Хоць пасьля міліарацыйных работ вельмі складана знайсьці пачатак рэчкі. Тым больш дасьведчыя людзі сцьвяржаюць, што рэчка цякла аднекуль з-пад Готкавічаў.

P. S. Пад час працы выкарыстаны ўспаміны Лескець Меланіі, Асіповіч Сафіі, Асіповіч Веры, Зуя Аляксандра, Міронавай Любы, а таксама іншых жыхароў мястэчка за што ім вялікая удзячнасьць.

Вусная гісторыя

Успаміны местачкоўцаў

Захавана мова апавядальніка

*Лескець Меланія*

Фэсты

*Пад час фэсту прадаваліся розныя прысмакі, такія, як пячэньня-птушачкі, галубкі, "лёды", цукеркі-"пятушкі". Дзеці багацейшых куплялі за грошы, мы мянялі на яйкі. Коні стаялі ля царквы, расклаўшы на вазах тавар. Мы хадзілі ад воза да воза--выбіралі што страйнейшае. Могілкі тады абгароджаныя былі, вароты прама як цяпер былі, прама перад імі і стаялі вазы. Пасьля гандлю прыехаўшыя госьці і сваякі разыхадзіліся па хатах, запрашаліся музыкі, пасьля трэ было адпрацоўваць за іх. Фэсты былі на Ўзьвіжаньне, трэці дзень Вялікадня, Сёмуху.*

*Вера Асіповіч*

Планіроўква мястэчка

*У нас былі* ***мястэчка*** *і* ***вёска*** *заскавічы. Так ім пісаліся пры Польшы на таблічках. На мястэчку была толькі адна вуліца, не лічачы галоўнай,—Крэўская, бо ішоў пуць на Крэва, быў раз'езд (пераезд чыгуначны). Калі пракла далі новыя пуці, то стары пераезд зачынілі. Гэта пры немцах другі пуць пралажвалі.*

Мануфактура

*Працавала я там з 1934 па 1939 год, пакуль замуж не выйшла. Быў гэта будынак з двума паверхамі: уверсе раскладвалі па формах, а ўнізе, дзе былі 3 горны, пад зямлёй, кахлю сушылі, на стале мылі яе, абмывалі чыстай вадой, глазуравалі. Працавалі там: Дудко Алімпіяда, Соня Сарока, Гарбачэўскія Вольгі, Канапацкі, Мілка Бабей, Дзевянцей*

*Марыя, Прадавы Вольга і Марыя. Быў там і немец адзін, грузны, таўсты, але добры і вясёлы. Кахлю фарбавалі ў белы, крэмавы, блакітны, зялёны колеры, ён і глядзеў за колерам. Калі прыбіралі гарно, немец прыходзіў глядзець. Мы яе дастанем, а ён стаіць і сьмяецца:" Ха-ха-ха...паціпаны колер!" А які ён там "паціпаны" мы і не ведаем, мо што брыдкое кажа? Кахля была вялікая і цяжкая, асабліва сырая, нясеш уніз штук дзесяць-цяжка. Але спрос быў вялікі! Бывала пасьпявалі пакаваць. Вагонамі грузілі. Сартавала там наша Ганька. Гліну мясілі нагамі: адной стаіш, другой месіш, што аж блішчыць, талькі пазьней ўжо пачалі каня ганяць, як чан зрабілі. Разьбітую і высушаную гліну перасявалі і зносілі на зіму ў такія выкапаныя і абкладзеныя ямы, дзе і застывала. Калі гліна была падрыхтаваная, прыходзілі фармаўшчыкі, парэжуць яе кавалкамі і ўбіваюць па формах, што выплаўляліся з волава. Кахлю вазілі на конях то ў Залесьсе, то ў Пруды, дзе загружалі на поезд. Клалі кахлю тварам да твара, папярэдне пераклаўшы саломай. Людзі і самі прыязджалі яе купляць, вазілі ў Смургоні і Крэва на кірмашы. А гаспадар, Доваль Гільман, хоць і габрэям быў, але ж такі ўжо добры. Калі на якое сьвята зьбіраешся, заўсёды даставаў з кішэні і даваў на дарогу, усім даў кахлі на печкі, калі хто памрэ ў вёсцы—заўсёды даваў пазыку. Так, калі на капліцы бляху мацавалі, ён таксама даў грошы. Куды ён дзеўся пасьля? Кохан, дзед стары, казаў, што зьехаў да брата у Кабыльнікі— выратаваўся. Пры саветах, да пажару, рабілі збаны. Вольга "марынішна", рабіла тэльку, кахлю такую маленькую.*

Сінагога

*Стаяла, дзе дарога на Шыкава ідзе, там стаяў нейкі дрэнны дом, пасьля Андрэй Сьвірыда пабудаваўся. Неяк, памню, там вартаваў шаланхай нейкі дурнаваты. Дзяцей усё пужаў ідучых зь лесу. Прыслужваў там Сашы Баўтроша бацька.*
*Рабін жыў на Крэўскай.*
*Асіповіч Сафія*
*Міронава Люба*

Школа

*У Залесьсі была сямігадовая, а ў нас "паўшэхная". Быў такі закон, што як ты ні вучыся, будзіш вучыццам да 14 гадоў. У 3 класе сядзелі 2 гады-"другарочнікі"( праграма па матэматыцы крыху складаней была). У 4 класе-3гады.*

*Перад уваходам у клас, над дзьвярыма вісеў каталіцкі крыж.*

*З ранку казалі разам з "кіроўнікам" польскую малітву. Закону божаму вучылі дзьве дзяўчыны з Беніцы, Галіна і Рыта. Усім хто вывучаў малітву давалі па кавалачку бліскучай фальгі; "золатцу".*

*У школе, бывала, і білі: за брудныя рукі "ў мыдла давалі". Калі слова якое беларускае скажаш, дык "вуха" атрымаеш. О-й, бывая як улупя лінейкай! Так ужара, што аж запячэцца! А быў такі яўрэйчык з мястэча, Абка Пятух. Дык ён вучыцца не вучыўся, ды ўсё ў ватных штанах хадзіў, бо калі пакладзе настаўнік на крэсла й улупіць яму па тым, на чым так не сядзіцца, то аж пыл пойдзе! Аднаго разу мы езьдзілі на экскурсію, цягніком з Прудоў да Залесься, 50 грошаў каштавала. Што ж за здавальненьне было!*

*Тады ж яшчэ не было станцыі ў Заскевічах. А мы ўсё ехалі і ў вакно глядзелі.*

*У школе сьвяткавалі толькі польскія сьвяты (3 траўня).*

*У адным канцы жыў кіроўнік, у другім быў яго кабінет, а тут-два клясы вузкія і адзін шырокі, дзе ў кожным вучыліся. Школа ў нас была старая, яшчэ з царскіх часоў. Пры немцах там жылі салдаты, таму мы хадзілі вучыцца то ў Хатуцічы, то ў Шыкава. Вучыліся па беларускіх падручніках, і ўсё было беларускае, толькі сьвяты, такія як дзень нараджэньня Гітлера, калі плялі вянок з чароту, былі нямецкія. Вучылі нас настаўнікі Каляда і Вайда, дык апошняга ў Міхневічах на вясельлі немцы застрэлілі. Такі быў настаўнік!..Як пачне бывая чытаць: «Ты мой брат, каго зваць беларусам...», так хараша чытаў. Помню, як яшчэ пры паляках было адкрыцьцё хатуцкай школы, сьвяткавалі недзе ля Вушы, дык нас частавалі хлебам ды салам.*

# Гісторыя храма маёй душы

Гісторыя царквы і веры на Беларусі--даволі складанае і яшчэ не распрацаванае як належыць пытаньне. Мо таму й няма грунтоўнай працы якая б разглядяла праблему ў межах дзяржавы, не гаворачы ўжо аб якім-небудзь рэгіёне.

У сваім невялікім эсэ мне хацелася б разглядзець рэлігійнае жыцьцё маленькага адрэзка нашай краіны, калісьці ляжаўшага на вялікай гандлёва-эканамічнай артэрыі, якая злучала Менск зь Вільняй, і называлася „Чорным шляхам". Мо так мы лепш зразумеем чым жылі нашы Дзяды і Прадзеды, нашы „карані" на гэтай зямлі?



Лебедзева канец XIX ст., вуліца перад касьцёлам.

***Лебедзева***

...Лебедзева-Маркава-Беніца...

Ці ня першай бажніцай на гэтым прамежку быў драўляны касьцёл "Нараджэньня Найсьвяцейшай Панны Марыі", пабудаваны яшчэ 19 ліпеня 1476 года пры падтрымцы ўладара мястэчка Аляксея Сямёнавіча Гальшанскага. Больш за трыста год прастаяў касьцёл, дорачы веру й сьвятло мясцоваму люду, пакуль у 1808 годзе не згарэў. І толькі ў 1847 (*ці ў іншых крыніцах--1856 г.*) па ініцыятыве мясцовага ксяндза Навіцкага пабудавалі новы будынак, і, памятаючы традыцыю, захавалі старую назву.

Добра адбілася на жыцьці мястэчка і пратэстанцкая плынь, якая была ў пэўны перыяд нацыянальнай верай магнацкага й шляхоцкага саслоўяў. 7 траўня 1558 года мястэчка набыў Мікалай Радзівіл Чорны, кальвініст, магнат, вядомы сваімі ідэямі аб незалежнасьці Вялікага княства Літоўскага і нелюбоўю да ўсяго польскага. Хутчэй за ўсё, пад яго патранажам у мястэчку й збудавалі мураваны кальвінскі храм, які ажно да 1632 года ня зьведаў ніякага ўціску, ня гледзячы на моцную плыню Контррэфармацыі. Цікава, што ў пачатку XVIII стагодзьдзя ў Віленскай акрузе налічваліся толькі чатыры касьцёлы „гэльвецкага веравызнаньня", а сьвятароў яшчэ менш, таму з 1702 года сюды прыязджаў казнадзей з далёкіх Жупран, што пад Ашмянамі. Але заняпад прыходзіць ўсё бліжэй: у 1754 збор прылічаць да жупранскага, службы будуць весьціся не больш за чатыры разы на год. І не дапамагло нават жаданьне князя Гераніма Радзівіла працягнуць жыцьцё збора падцьверджаньнем 15 чэрвеня 1756 года прывілея на фундуш маркграфіні Брандэнбургскай Люд.-Кар.Радзівілаўны за 20 чэрвеня 1687 года. Відаць, яму было наканавана разам з адыходам караляваньня і княжаньня Аўгуста III у 1764 годзе сыйсьці таксама ў гісторыю. І толькі ў людской памяці пра той невялікі курган *(на месцы збора)*, што ў кірунку Лабачоўкі, у вярсце ад мястэчка, і называецца то "Царковішчам", то "Старым сялом", будзе хадзіць паданьне пра колішнюю бажніцу, што сышла пад зямлю.

Што да першай царквы, дык тут таксама не абыйшлося без таямніц. Гісторыя дае зьвесткі, што царква пабудаваная княжной Аспасіяй Радзівіл у XVI стагодзьдзі, стаяла на гандлёвай плошчы, дзе пасьля пажару канца XVIII пабудавалі габрэйскія амбары. Але ж чаму тады пры перапісе 1638 і 1861 у дакументах няма ніводнага

ўпаміна аб царкве ці касьцёле, хаця ўжо з XVI стагодзьдзя Лебядзева зьяўлялася мястэчкам, а якое можа быць мястэчка без бажніцы? Хутка пасьля пажару ў 1786 годзе адбудавалі новую, драўляную, уніяцкую (стаяла, мяжуючы з плошчай і свірнам, па 1880г., пакуль ў 1869 годзе не пабудавалі з каменьняў, узятых на "царковішчы" Крыжаўзьдзьвіжанскую). Мо таму і атрымалася нетрывалай і патрабавала папраўчых работ кожны год. Меліся ў Лебедзеве і свае сьвятыні: абраз Аляксандра Неўскага, падараваны Аляксандрам II, сьвятое месца ля крынічкі, пра якую адзін сьвядомы местачковец напісаў артыкул у 1907 годзе ў „Нашай ніве",--газэту, дарэчы, шмат хто з местачкоўцаў выпісваў.*(2)*

*"У вярсьце ад нашага мястэчка цячэ невялікая рэчка праз маёнтак пана Саковіча. Даўно ўжо ў народзе ходзяць слухі, бытцам у той рэчцы калісьці зьявіўся цудоўны Пан Езус. З году ў год на каталіцкае сьвята "Сэрца Пана Езуса,, каля гэтага цуда зьбіраюцца тысячы простага народу. Тамака людзі молюцца, мыюцца вадой з тае рэчкі, ды нясуць ў касьцел ахвяры: грошы, шмат яек, лёну, воўны і іншага дабра. Зьбіраеца тут такім парадкам больш як на тры сотні рублёў.- Поп мясцовы пазайздросьціў ксянзу добрага дахода і зрабіў у той самы дзень праваслаўнае сьвята.І ён, як дагэтуль ксёнд, угаварвае народ, каб маліўся каля той рэчкі з цудам, але ахвяры прыносілі не ў касьцёл, а ў цэркву.-Хоць ніколі не было чутно, каб каму гэты цуд якнебудзь дапамог, але ўсе ведаюць адно, што ксяндзу і папу ён такі добра памагае..."* *„ Опальны*

## Маркава

Хоць гэта места вядомае з 1415 года, як значна маладзейшае за Лебедзева(1387), эканамічна нічым не саступала. А мо нават і пераўзыходзіла!

Маркаўская пушча, багатая на розную дзічыну, сплаўляла лес у Эўропу яшчэ з 1525 года. А дзяржаўныя і прыватныя корчмы прыбыткам раўняліся да такіх гарадоў, як Берасьце--чатыры копы грошай *(за іх ў той час можна было набыць карову і вала).*

Царква тут стаяла здаўна, што нават ніхто пра яе ня памятае, толькі як сьлед засталіся рэшткі падмурка, недалёк ад цяперашняй. У 1831г. з узмацненьнем русіфікацыі як адказам на нацыянальна–вызвольнае паўстаньне, ля старых муроў на месьце колішняй уніяцкай паўстала драўляная, часовая, якую замяніць ў 1860 годзе чарговая на нашай зямлі “мураў’ёўка”. Ужо на пачатку XVII стагодзьдзя тут дзейнічае касьцёл. XVII стагодзьдзе—крыху пазнавата для такога мястэчка. Але гэта перадусім абумоўлена тым, што да другой паловы XVI стагодзьдзя гэта былі ўладаньні Радзівілаў, а іх, у Нясьвіжы не асабліва цікавіла, ёсьць бажніца ў Маркаве ці не, тым больш у суседнім мястэчку *(Лебедзеве)* стаялі касьцёл, кальвінісцкі збор...

Другі касьцёл пабудавалі дзякуючы інфлянцкаму кашталяну Яну Шчыту і яго жонцы ў 1740 годзе. Пры касьцёле мелася нават школа *(ці не першая ў ваколіцах!)*, і хутчэй за ўсе езуіцкая, што было абумоўлена тым часам.

На вялікі жаль, драўляныя пабудовы доўга не стаяць— трухнеюць або гараць у полымі вайны. Аб іх былой велічы напамінам застаюцца каплічкі . А дзе яшчэ можна было пабачыць у Эўропе драўляныя касьцёлы, як ня ў Нас?

### Беніца

Яшчэ ў дахрысьціянскія часы ў многіх местах *(дубравах, ля крыніц, валуноў, узгорках)* былі паганскія капішчы. Пра іх наяўнасьць кажуць толькі песьні, легенды, паданьні *(для былых капішчаў характэрна такая тапаніміка, як Лысая Гара, Шведская або Французская і інш. А таксама легенды аб колішняй царкве, якая калісьці стаяла ды потым правалілася пад зямлю).* Хутчэй за ўсё, такія капішчы былі ў Беніцы *(што падцьвярджае легенда аб царкве, якую з-за нейкай людской правіннасьці, засыпаў пан зямлёй разам з людзьмі,--і ўтварылася гара; знаходкі каменных сякер-*

*людзі жылі тут даўно, і,вядома недзе павінны былі маліцца)* і ў Заскевічах *(тап. Лысая Гара)*. Што да хрысціянства, то ўжо ў 1582 годзе ў Беніцы стаіць царква *(самая першая сярод суседніх мястэчак, з 1596 года уніяцкая)* сьвятога Гальяша-прарока. Аб тым, што тут калісьці магла быць уніяцкая бажніца, як напамін засталіся каменныя надмагільлі з крыжамі сьвятой Еўфрасіні на могілках некаторых суседніх мястэчак.*(3)* Куды цікавейшую й багацейшую гісторыю мае Троіцкі касьцёл. Аб абставінах яго заснаваньня нават захавалася легенда:

*"Аднаго разу Міхал Казімір Коцел па справах паехаў у Маладэчна, і ўжо вяртаўся да дому, як коні панесьлі, парваўшы вупраж. Міхал хацеў стрымаць іх, але коні беглі ўсе хутчэй і хутчэй. І давай тут Коцел прасіць Бога, што дзе толькі коні спыняцца-- там і касьцёл пабудую. А коні прыбеглі да маёнтка, да самай брамы. І толькі Коцел сышоў на зямлю, не пасьпеўшы перавесьці дух, як адразу загадаў пачаць будаўніцтва."*

Загад выканалі за тры гады, і ужо ў 1703 годзе можна было мілавацца адным з выдатнейшых помнікаў позьняга віленскага барока. Асьвячаць Троіцкі касьцёл было даручана віленскаму біскупу Бжастоўскаму, што ён і зрабіў у 1704 годзе. Асоба Міхала ў лёсе Беніцы яшчэ не ацэнена, а постаць гэта была вызначальнаю ў лёсе ўсяго рэгіёна. Чаго толькі вартая школа, якая дзейнічала ў прамежку з 1780 па 1842 пад пачаткам бернардынаў, што несьлі асьвету не зважаючы на веравызнаньне.

Пад канец свайго жыцьця, ужо бачачы сваю блізкую сьмерць, Коцел замовіў намаляваць свой *партрэт ў натуральную велічыню, стоячы ля стала, пад якім быў адчынены куфэрак з грашыма ў мяшках, на якіх пазначаны сумы. Па загадзе партрэт павінен быў вісець ў скляпеньні касьцёла ля самай труны, завешаны тканінай, а ў труне ляжаць пазначаная сума, якую можна узяць толькі на рамонт касьцёла. Прадчуваньні спраўдзіліся: у 1722 годзе, ва ўзросьце 69 гадоў Міхал Казімір памірае. Па традыцыі фундатара касьцёла пахавалі пад парогам сьвятыні. Праз колькі дзясяткаў гадоў па сьмерці Коцела праламаўся дах* (але не на касьцёле, а ў прыбудаваным да яго кляштары). *Бернардыны, пад началам кс. Чапкоўскага, вырашылі ўзяць грошы, адкладзеныя фундатарам. Зь вялікімі цяжкасьцямі браты пачалі адчыняць труну. Ззаду братоў стаяў Чапкоўскі, молячыся і акрапляючы сьвятой вадой. Але як толькі яны адчынілі труну адразу*

*згасла сьвятло ў лямпах і каменная труна сама зачынілася, ды так, што трэснуўла, вялікім грукатам да паўсьмерці напужаўшы прысутных. Доўга праляжалі браты-бернардыны на падлозе, молячыся і гучна чытаючы „REQUIESCAT IN PACE!", пакуль адважыліся сысьці. Пасьля таго выпадку прах Міхала доўга ніхто турбаваць не адважваўся.*

Абраз вісеў да 1851 года, покуль Троіцкі касьцёл не перабудавалі ў царкву, распусьціўшы 14 манахаў і зачыніўшы, а пазьней і зьнішчыўшы кляштар. І ня шмат хто ведае, што пры кляштары меўся ўласныя архіў, бібліятэка, мастацкая галерэя, парк, багаты сад, сажалкі з каналамі (*пазьней нашчадкі іх будуць называць беніцкімі ставамі*), а пры двары Коцелаў працаваў філосаф Мотвіл. І ў гэты маленькі Пьемонт, зачароўваючыся прыгажосьцю касьцёла, лямуса, сядзібы і парка, не раз заязджалі Міхал Агінскі, Тамаш Зан, Станіслаў Манюшка, Напалеон Орда, Уладыслаў Сыракомля, Францішак Багушэвіч...

Колькі зараз маглі б расказаць гэтыя муры... Хаця б пра слыннага нашчадка свайго дзеда Міхала Казіміра–ротмістра кавалерыі, генерал-маёра паўстанскіх войск Тадэуша Касьцюшкі, ваяры якіх ішлі на сьмерць дзеля абароны сьвятога-Айчыны, сваёй дзяржавы-Вялікага княства. Паўстаньні 1830-1831,1863-1864 гадоў...

1812 год, калі пасьля сваёй паразы Напалеон уцякае ў Францыю і чарговая мара патрыётаў аб незалежнасьці на штыках французскай арміі-учарашні дзень. Але Міхал застаецца верным свайму слову і сваім перакананьням, і, ведаючы чым гэта можа стацца для яго, запрашае праязджаючага 22 лістапада ля Беніцы Напалеона адпачыць у маёнтку *(Пазьней з таго пакоя, дзе ён начаваў зробяць мемарыяльную залю).* І хто ведае, мо ў пакутлівыя для сваей душы хвіліны, Яго Вялікасць разчыняў груваcткія дзьверы касьцёла, праходзіўся ля скульптураў сьвятых, і, стаючы на каленях, моўчкі спавядаўся Богу, усяму сьвету, самому сабе?.. І ў знак падзякі заставіў свой скарб у вялікім падзямельлі касцельных муроў, якія са слоў мястачкоўцаў, цягнуліся ажно да маёнтка? Так гэта ці не, вядома толькі старым мурам. А яны маўчаць, маўчаць мо таму, што дзьверы так доўга зачынены, знутры толькі пустэча і холад, спаганеныя скляпеньні, раськіданыя надмагільлі, павыцяганыя і пабітыя памятныя пліты колішніх герояў...

Пасьля скасаваньня касьцёла будынак выконваў функцыі царквы, пакуль насупраць (у1886) не пабудавалі новую царкву. Пабудавалі цэрквы і ў Вяжуцях, Годкавічах, Заскевічах...Ды прастаялі яны ня доўга: да

пяцідзесятых гадоў XX стагодзьдзя, пакуль іх не разабралі на бярвеньні для пабудовы калгасных хлявоў, а мураваныя перарабілі пад склады. Ды і тут касьцёлу пашанцавала. У 1988 годзе, хоць і не жыло тут так шмат каталікоў, як раней, Калачык (старшыня калгаса) даў загад рэстаўраваць бажніцу. Але на вежы замест крыжоў паставілі "штыры", што і не спадабалася начальству, і таму іх хуценька замянілі крыжамі-- сьвятыня павінна заставацца сьвятыняй!

---

Лебедзева 1476-Маркава XVII ст.-Беніца 1582, 1703.
Нібы па ўзрастаючай ў кірунку сьветлай Вільні, сьвятых для кожнага Беларуса Базылянскіх муроў, сьвятой Вострай Брамы.
Які б працяг меўся ўсей гэтай прыгажосьці?!

P.S.Гэта зямля, як і ўвогуле ў вялікім княстве, была шматканфесійнаю, што амаль ужо забыта. Забыта й прысутнасьць татараў у Лебедзеве і Беніцы *(былой ускраіне вялікага татарскага разсяленьня)* яшчэ на пачатку гісторыі мястэчка, і ў вёсцы Турэц, аб чым сьведчыць і сама татарская назва. Ня шмат хто і ўспамінае аб прысутнасьці ва ўсіх мястэчках габрэяў. Пасьля другой сусьветнай засталіся толькі габрэйскія могілкі. Няма й заскевіцкай сінагогі...

Пасьля страты нашымі продкамі-ліцьвінамі незалежнасьці ў 1794г., і пачаткам русіфікацыі, рухальнымі сіламі якой, са словаў Кацярыны II, былі: "руская вера, рускі настаўнік, рускі чыноўнік", у 1839 годзе зьліквідавалі ўніяцкую царкву, у другой палове XIX стагодзьдзя--усе ордэны і брацтвы. Паступова пачала складвацца сітуацыя, якую добра апісаў у сваім вершы „Хрэсьбіны Мацюка" першы майстар беларускага слова Францішак Багушэвіч.

## Дадатак

1.У 1910 годзе пабудавалі капліцу,а ў пачатку стагодзьдзя касьцёл
2.Наша Ніва №22 1907года
3.У прамежку з 1796 па 1839 уніяцкія цэрквы былі ў Лебедзеве, Маркаве, Заскевічах. Гісторыя захавала імёны апошніх сьвятароў-уніятаў, якіх прымусілі перайсьці ў праваслаў'е: Вінцэнт Багушэвіч у Лебедзеве(Сьв. Тройцы), Фабіян Акуліч у Маркаве(Сьв. Тройцы), Ян Андрушкевіч у Беніцы (Гальяша прарока) й Заскевічах.

## Дрэва жыцьця

Веданьне свайго мінулага, мінулага свайго рода, дае нам магчымасьць знайсьці сябе, сваё месца ў гэтым сьвеце, на гэтай зямлі, а аднаўляючы імёны мы маем унікальны шанец--аднавіцца самім, навучыцца ў нашых продкаў і папярэднікаў. Не дарма ў народзе кажуць, што калі ня ведаеш, адкуль прыйшоў, то й ня ведаеш куды пойдзеш.

Доўгі час зьнішчалася сувязь з нашым „карэньнем", і таму цяпер нашае дрэва, "Дрэва жыцьця", і ўяўляецца мне магутным дубам, заваленым „каменьнем забыцьця". І толькі дзе-нідзе можна ўбачыць галінкі зь зялёным лісьцем.

### Па мячы.

...І на памяць прыходзіць успамін: я–дванаццацігадовы хлапчына, зімовым ранкам прыязжаю на лыжах да бабулі. Бяру жменю сушаных яблыкаў і грушаў, дастаю з шафы стары, пажоўклы фотаальбом маёй прабабкі і утульна ўладкаваўшыся ў мяккім фатэлі, пачынаю яго разглядаць. Да мяне падыходзіць бабуля, прапаноўвае цяплей апрануцца, на што я адмаўляю, што мне цёпла, і я пачынаю распытваць яе пра людзей чые знаёмыя або зусім не знаёмыя твары глядзяць на мяне.

І гэта мой звычайны выходны, поўны новых адкрыцьцяў і ведаў аб новым і часткова забытым. Ужо тады я ведаў пра гаротны і тыповы для кожнай тагачаснай жанчыны лёс сваёй прабабкі:

*Нарадзілася яна ў1901 годзе ў невялічкай вёсачцы Яневічы, больш падобнай да хутара, у вельмі гаспадарлівай сялянскай сям'і. Яе бацька апроч вядзеньня гаспадаркі майстраваў сані, якія карысталіся добрым попытам, як на Смургонскім так і на Лебядзеўскім кірмашах.(1)*

*Ад самага нараджэньня Вольгі, яе ўжо чакалі гора і складанасьці. Пачатак стагодзьдзя выдаўся складаным ня толькі з-за пачатку вайны, якая прайшла фронтам па гэтай зямлі, але й з-за вялікага голадау, эпідэміяў тыфу і воспы. Хвароба закранула амаль кожную сям'ю, у тым ліку і Драмлюка Аляксея; з дванаццаці дзяцей ў сям'і засталося ў жывых толькі чацьвёра (бывала, у дзень паміралі па двое). Гору бацькоў не было межаў.*

*Падавалася, што такі цяжкі на пачатку жыцьця лёс у будучым зьменіцца, вось бы толькі замуж добра выйсьці. Доўга Вольга прыглядалася да сватоў, пакуль не выбрала Бабра Пецю з Заскевічаў. Ну і што, што ўдавец, што мае дзіця(2), затое вунь які*



*гаспадар, нат млынок свой мае, да таго ж такі гожы і мілы сэрцу.*

*Зрабілі вясельле, жыцьцё пачало наладжвацца, як у тых дзявочых марах. Да таго ж, зямельная рэформа дала шанец набыць зямлю пад Сівіцай зусім за капейкі. Ды вось 38-ы год стаўся пераломным: памёр яе чалавек, кармілец сям'і. „На шыі" у маці засталіся чацьвёра дзяцей .*

*-Што рабіць, як быць? Мо падацца ў савецкі „рай": шмат хто пайшоў, ды хто вярнуўся? Пакуль ёсьць зямля, неяк пражывём...*

*І пражылі. І ў пераломны 1939, і ў гады вайны. Хоць было не разьвіталіся з жыцьцём. (Немцы ўбачыўшы ў гародах зямлянкі, зь якіх выходзілі людзі пасьля чарговага бамбаваньня рускімі, напужаліся і прыняўшы іх за партызанаў, павялі амаль усіх расстрэльваць на могілкі. Сусед Апіфан заўважыў сярод іх і Вольгу--пачаў прасіць, каб не расстрэльвалі. Добра што адзін з немцаў ведаў польскую мову, яму і растлумачылі ў чым справа). Ды бяда напаткала тады, калі яе ніхто не чакаў, калі ўжо вырасьлі дзеці і сталі на свой жыцьцёвы шлях. Гора, найвялікшае гора для маці-сьмерць свайго першага дзіцяці-Валодзі, героя. Чаго толькі ён палез, на тым Гартопе, ратаваць свайго сябра? Сябар застаўся жыць, а Валодзя..*

Цікава бабуля разпавядае, зь якімсьці сьветлымі і шчасьлівымі ўспамінамі, гледзячы скрозь усё ў сваё маленства. І толькі я, калі мне штосьці не зразумела ці не вядома, перабіваю яе пытаньнем, ды і то баючыся што прыйдзецца загаварыць аб іншым-надзённым. А за вакном заадно і пахмурна і, дзякуючы сьвежа выпаўшаму сьнегу, сьветла. Бягу ў лазьню, падкідваю дроў, і адразу ж у хату. Паціраю рукі і перагортваю наступную, абклееную „карткамі" старонку. Забыўшыся на ласунак разглядаю высокага, рослага чалавека ў якімсьці эўрапейскім горадзе. Гэта мой дзед Пеця. Цікавы й у яго лёс. Нарадзіўся ў новай, толькі адноўленай







пасьля жудаснага пажару 1907 года, вёсцы. *О-то ж дасьціпнае дзіця было, самы першы сярод дзетвары! "Актор!". А ці ведае хто, чаго ўсё гэта яму каштавала?*

*Тодар (бацька Пятра) быў паважаным на вёсцы чалавекам. Яшчэ зь першай вайны валодаў польскай ды нямецкай мовамі, што ня раз выратоўвала і ў другую вайну. І вось гэты чалавек, прыціснуты нястачай, хацеў палепшыць дабрабыт сям'і. А як яго палепшыць, маючы ўсяго дзесяць дзесяцін зямлі?*

*-Што тут рабіць? Трэба шукаць лепшай долі. Мо падацца да саветаў? Тарас (родны брат) во прыехаў з Амэрыкі, яго паслухаць--і там рай ? Ды і па „радзіву" кажуць--рускія зямлю дарма даюць. Вырашана... Нешта ж трэба рабіць...*

*І вось, аднойчы вечарам, узяўшы невялічкі клунак, крыху грошай, зь Дзям'янам і Пятром падаўся ў бок Расеі, дарогай на Радашкавічы, кажуць, там пераходзілі мяжу. Як там што было, цяжка сказаць, але іх пераняли. Бацьку зь Дзям'янам адправілі да дому, а Пецю пакінуулі ў інтэрнаце з тэатральным ухілам. Праз колькі часу вярнуўся і Пятро. Колькі зайздрасьці было ў хлапчукоў да яго здольнасьцяў!*

*Не доўга давялося цешыцца дзіцяці. Ён рос, зьмяняўся, як зьмянялася ў той час і ўлада: на зьмену палякам прыйшлі бальшавікі, амаль сьледам—немцы. І, хлопец нават не разьвітаўшыся з роднымі і сваёй дзяўчынай--Меланіяй, мусіць ехаць у якасьці працоўнага ў Нямеччыну. Ды й тут лёс паставіўся добра да "вечнага вандроўніка". У Нямеччыне ён стаўся не рабом, а амаль членам сям'і. Неаднойчы ён пацяшаў сваімі фокусамі ня толькі малодшую дачку гаспадара, але і старэйшую--зусім дарорслую.*

*-Мо й добра было б застацца тут.*

*Ды не, ня змог, бо недзе там, на Усходзе,--Дом, Родныя, Дзяўчына. І ўжо ў першыя дні перамогі ён вяртаецца, у родную вёску. А Сівіца стала ўжо зусім іншай , іншымі сталі і людзі. Неяк з перасьцярогай глядзяць на здаровага,дужага, апранутага ў нямецкі фрэнчык і файныя чаравікі хлопца. Ды ўсё гэта хутка расьсеілася, і, як знак даверу ад новай, савецкай, улады, яго адправілі на вайсковыя зборы. Іх вінен быў прайсьці кожны неслужывы хлопец.*

Памёр дзед рана: хварэў, крыху грашыў гарэлкай. Але шчасьлівым, бо паміраў дзедам, маючы ўжо першага ўнука, які, падвучаны бабуляй, прасіў у дзеда „Дзед, дай рубель! На цукеркі!"--і дзед з задавальненьнем даваў тры.(3)

Цяжка ўспамінаць, а потым з прыемнаага лета свайго дзяцінства зноў вяртацца да сягоньняшняга дня,螺параўноўваць, яшчэ раз перажываць як дзіцячыя радасьці так і складаныя хвіліны. Стамляе...

Таму пасьля добра выпаленай лазьні, са сьвежым, толькі з гарышча, венікам, разьвітваюся зь бабуляй, бяру падарунак-акуратна зьвязаныя, цёплыя шкарпэткі і накіроўваюся ў дарогу.

Мая дарога да дому ідзе ўздоўж рэчкі, крыху замёрзлай ля берагоў, але дыхаючай парам; па добра ўтаптанай санямі і машынамі дарозе; сярод вялізных векавых клёнаў, семем якога забаўляліся ў дзяцінстве, разломваючы на палову і, пасьлініўшы, прылепліваючы да носа, або на вушы--“носікі”. Ды цяпер чамусьці не зачароўвае гэтае хараство, цесна павязанае і пераплеценае зь дзяцінствам. Чамусьці думаю аб бабулі, аб яе заўсёды жывых і вясёлых вачах, „хлапечым характары”, вялікай жыцьцёвай сіле, якую не вычарпала ані скрадзенае дзяцінства, ані першая, яшчэ цяжкая для дзіцяці, якому жыцьцё не дало давучыцца, праца ў лебядзеўскім лясгасе, ды калгасе. Сілу жыцьця не забярэш, яе бяруць ад маці-удавы, ёй вучацца ў сваіх дзядоў. Ды і то застанецца яна толькі тады, калі частку перадасі сваім дзецям, свайму працягу.

Бабуля-мой першы сябар і настаўнік, яна і мне даравала сілу. Ды больш! Ад каго я мог навучыцца, як не ад яе, прыказкам, прымаўкам, жартачкам і „амікдотам”, за якія ня раз даводзілася ў садку стаяць у куце.

Колькі раз, бабуля я быў тваім спадарожнікам. Нават у такую далекую для мяне Беніцу, на фэст, дзе адстаяўшы якую гадзіну, можна было купіць такі смачны і незвычайны на той час цукровы пеўнік.

## Па кудзелі.

Са сваімі продкамі па кудзелі давялося мне пазнаёміцца ў далекіх Ластаянцах, ўжо дарога да якіх была цэлым падарожжам: праз Крэва, Лоск і іншыя вёскі і мястэчкі, такія стракатыя і нязвыклыя для вока.

Яшчэ ў дзяцінстве мяне прываблівала гэта мейсца не вядомай мне загадкавасьцю: Сіняя гара, Родзівечава, шматлікія ўзгоркі, рэчка Ластаянка і зусім непадобны на „мой" далягляд. Таму заўсёды прыязжаю сюды з вялікай прыемнасьцю. Кожны дзень падымаюся ледзь завіднея, калі вёска яшчэ ляжыць у цішы і спакоі, спускаюся да ракі і ахінаюся ў вільготны, халодны туман--іду ў грыбы. Зачароўвае. І не патрэбна ніякай машыны часу: каб зазірнуць у мінулае, варта толькі спусьціцца да Ластаянкі, павольна і глыбока ўздыхнуць, убіраючы разам з паветрам частку чароўнай вільгаці. Як праз туман тыя ж будынкі будуць падавацца нейкімі іншымі. А ў паветры будзе лунаць час мінулага, час тваіх продкаў, тваіх „каранёў" на гэтай зямлі.

І вёска, бы тая рэчка, ідзе ўздоўж па ўзгорку, пятляючыся завулкамі, старымі прыдарожнымі крыжамі ажно да касьцёла, які калісьці быў уніяцкай царквой. Лёс вёскі аналагічны кожнаму заходнебеларускаму паселішчу: польскія асаднікі, школы, спалячаная шляхта... Адно добра што не было таго тэрору, як на Ўсходзе. Тут асоба заставалася асобай, а там--„роўнымі", "такімі як і ўсе".

---

У гэты перыяд, у гэтай вёсцы і нарадзіліся мае бабуля і дзядуля. Дзядулін бацька, як і яго бацькі Мартуновічы, здаўна жылі на гэтай зямлі, беручы ў жонкі дзяўчат з суседніх вёсак.

*Вікенцій быў сапраўдным гаспадаром, працавітым майстрам, ніводнай будоўлі не праходзіла безь яго, ні адну печку не паклалі. Колькі розных інструментаў і прылад было ў ягоных сенях! Можна нават цэлы музей скласьці. Усе старыя, некаторыя самаробныя, прывезеныя з Польшы. А колькі ўсё гэта каштавала? Во! Не кожны мог дазволіць сабе мець такі скарб.*

*З прыходам "першых саветаў" яго, як узорнага гаспадара, зрабілі кіраўніком калгаса „Цветущчая Беларусь". Тут не трэба праводзіць паралелі паміж Усходняй і Заходняй Беларусьсю. Былі розныя адносіны, розныя людзі, розныя працэсы. Ён не быў камуністам, таму і застаўся жывы пры прыходзе немцаў, яго проста*

*„попросілі", і ён ня мог адмовіцца. І, гэта ведаючы, людзі не папракалі, ніхто нават не даносіў за часы нямецкай акупацыі. Ён, як і ўсе вяскоўцы, па чарзе завозіў дровы ў бліндаж, будаваў масты, гадаваў дзяцей, вырошчваў хлеб. У 1944 годзе, пад канец акупацыі, пры адступленьні Вікенція ўзялі ў абоз, як аднаго з нямногіх, хто меў каня і калёсы. Пад частымі абстрэламі і бамбаваньнем ледзь дабраліся да Ліды, дзе спыніліся пераначаваць. Ноч выдалася халодная.*

*-Той жаўнер, вун, сьпіць сабе, ў вус ня дзьме, у цёплым шынялі, а тут толькі з дома фрэнчык узяў. Зімна. Ты глянь, добра сьпіць, нават ружжо адклаў. Вось каб тое ружжо...*

*Уміг падыйшоў, ціха перадзёрнуў затвор і...адыйшоўшыся выкінуў яго ў кусты.*

*-Ёсьць жа на сьвеце Бог, гэта ж такі чалавек, як і я. Доруй Божа дурныя думкі.*

*Пабудзіў колькі сяброў і цішком падаліся да дому. Дома бацьку сустрэлі з радасьцю: ужо ня верылі, што вернецца, а ён прыйшоў, ды й прысмакаў прынёс. Усёй сям'ёй каштавалі прынесены пачастунак--поўны кубачак чакаляду.*

Пражыў Вікенцій доўгае жыцьцё, перажыўшы цяжкія пасьляваенныя гады, ажаніўшы дзяцей, пахаваўшы свайго, зь дзяцінства хворага сына Івана. Памёр, маючы 88 гадоў, паміраў шчасьлівы; бо сын ужо вярнуўся, вярнуўся з жонкай і дачкой, з далекай Расеі.



Цікавай і не менш адметнай асобай быў Касабуцкі Восіп. Паходзіў ён са старажытнага, Мазавецкага шляхоцкага роду, вядомага з 1500, які з пачатку XVIII стагодзьдзя меў ужо свае карані і на землях Літвы. Гэты чалавек меў і адпаведны выгляд, хоць зь дзяцінства хварэў на астму, гэта ні як не адлюстравалася на яго твары, стане. Мажны шляхціц, які лічыць сябе на роўні з каралём, не танна апрануты, з карманным гадзіньнікам.

*Розуму гэтага чалавека можна толькі пазайздросьціць: умеў чытаць і пісаць па-польску і па-руску, выпісваў газэты, працаваў на чыгунцы інжынэрам. І ў тыя гады, калі іншыя галадалі, клалі зубы на*



*паліцу, у яго сям'і заўсёды было дастаткова соевай мукі, зь якой шторанак пяклі духмяныя бліны, не забываючы падзяліцца і з суседзямі.*

*І пры саветах і немцах Восіп увесь час працаваў на чыгунцы. Нават да 40-га лічыўся дэпутатам у сельсавеце. Каб неяк выратавацца ад немінуемага тэрору, прыйшлося пагадзіцца на пасаду, і навучаць дзяцей, каб хаця ж нікому не сказалі пра сваё шляхоцтва. Ды й за гэта давялося ня раз разлічвацца, як самому, так і жонцы--толькі ўжо пры немцах. Ня раз прыходзілі яго шукаць--а хаваўся Восіп на гарышчы, пад саломай і сухім бульбяным бацьвіньнем. Вольга (жонка) дык увогуле цудам уратавалася: вялі расстрэльваць, бо не хацела казаць, дзе мужык хаваецца, ды пакуль прыкурвалі, пасьпела ўцячы. Дома заставацца было небясьпечна, таму й, бывала, выконваў загады партызанаў; перавозіў у бочцы з палівам схаваныя ўлёткі.*

*-Вайна мінула, неяк пераўжылі, а як пераўжыць гэтыя сьмелыя вандроўкі дачкі Аляксандры па Ўкраіне, дзе мо зараз вайна будзе, па Расеі, Карэліі, куды падалася ў сьлед за братамі? Трэ ліст які даслаць, павіншаваць з надыходзячым 65-м.*

*Ліст дайшоў, поўны болю ды цяжару, жаданьня пабачыць унучку. Гэта быў яго апошні ліст.*



З тога году Вольга жыла адна. Усе дзеці ў Карэліі, толькі Таня недалек ад Сьвіра. І тут, доўгімі вечарамі, калі рабіць асабліва не было чаго, яна гартала фотаальбом, старую, прывезеную дзецьмі, газэту, успамінала сваю сям'ю, бацькоў, сясцёр і братоў, лёс брата Івана--таямніцу якога нават ня хочацца ўспамінаць і пасьля сьмерці маці.

*З пачаткам вайны прызвалі яго ў польскую армію. Колькі там--праваяваў невядома, але трапіў у палон, пры перапісе назваўся палякам, быў аддадзеным працоўным у нямецкую сям'ю, дзе прызначылі ўпраўляючым над астатнімі працоўнымі. Працаваў добра, таму і дазволілі зьезьдзіць да дому. Гасьцяваў ня доўга--трэ было вяртацца, бо калі ня вернешся--астатнія не пагасьцююць. Больш пра яго нічога ня чулі. Казалі, людзі бачылі ў Жэрлаках, калі ў карчме начаваў. Праз колькі часу знайшлі ў мурашніку шкілет у якога, на верхняй ськівіцы не было двух зубоў, якраз на тым*



*месцы, дзе ў Івана былі залатыя. Па рэштках бацька пазнаў сына. Пахаваў моўчкі, нікому не кажучы, бо сказаць жонцы, і без таго так моцна хворай,--нельга было.*

---



Сяжу на вялікім камені, ля Дзеда, "перакурваем", абчышчаем сьмецьце з грыбоў, кошыка, выкідваем дрэнныя грыбы. Абодва маўчым.

Шалясьціць, б'ючыся аб вялікае лісьце і стройныя яловыя галінкі, дробны дождж.

Я ўсё думаю, як падысьціся да расповеду пра дзедава падарожжа, якое разцягнулася на некалькі гадоў. Ды дзед Сяргей, нібы адчуваючы гэта, сам пачынае расповед, ламаючы цішыню сваім моцным голасам.

*Маладымі былі, яшчэ дурнаватымі. Ды й агітатары ўсялякія прапаноўваюць добры заробак, ну і пагадзіліся. Хацелася адчуць сябе па сапраўднаму дарослым, зарабіць крыху грошай: што за прыбытак з той крамы? Сьвет хацелася паглядзець, Шура ўжо на Украіне пабывала. Ну і паехалі мы ў Слуцак, дзе ўсе сабраліся і на БМЦ (будаўніча мантажным цягніку) паехалі катацца па Расеі. Па дарозе і ажаніліся. Прыйшло пісьмо было з дому, бацькі прасілі вярнуцца, мы і вярнуліся. Не шкадую.*

Ізноў маўчым. Бачу-дзед стаміўся, разьмінае руку, якая ўжо другі дзень баліць. Устаём і павольна спускаемся з гары. Каб неяк працягнуць размову, прашу дзеда распавесьці што-небудзь пра Ластаянцы. *Ды што я ведаю, хіба бацька што расказваў, ды зь дзяцінства? Ну слухай, гісторык. Калісьці мне яшчэ бацька расказваў што тут, ля Родзевічавай гары быў маёнтак паненкі. Ад яе гэту гару так і назвалі. Дык вось аднаго разу паклікала яна мужыкоў на працу. Пакуль яны там касілі, панна Родзевіч ўсё галасна пела, добры мела голас, ды скакала па полі, нешта зьбіраючы. Прышоў час перакусіць, усе селі за стол. Падалі парэзаныя памідоры, яшчэ гарачыя катлеты, Дачаго ж смачныя былі! Ужо даядаючы, пачалі пытацца, чаго яна па полі бегала. „То жабкі лавіла, для катлет." Мужыкі ўсе як адзін паўставалі са стала і пабеглі хто куды, трымаючыся за жываты. Не было ўжо ў іх ахвоты спрабаваць панскія стравы.*

Перайшлі дарогу, ізноў убіліся ў змакрэлую, калматую восеньскую

траву, зжаўцелае лісьце. Павольна ідзём у кірунку Ластаянкі, паглядаючы ў бок Сіняй гары.

*Нас у дзяцінстве ўсё страшылі: там на Сіняй гары калісьці манастыр стаяў, ды аднаго разу праваліўся пад зямлю. Доўга я малы думаў, што сталася з тымі манахамі, мо яны там жывуць пад зямлёй і цяпер?*

---

Чаруе гара сваёй веліччу і прыгажосьцю, асабліва ранкам, калі ідзеш да першага цягніка. Ён завязе мяне да дому, абарваўшы спатканьне з мінулым.

Дадатак

(1)Аляксей меў даволі сьветлыя валасы, за што яму жонка не раз казала:"Наш дзед як яблынька цьвіце".

(2)Косьця быў даволі цікавым юнаком: аднаго разу змайстраваў ровар з коламі ад калаўрота. Бацька, бачачы добрыя здольнасьці, набыў яму „тачыльны станок".

Пасталеўшы, хлопец зьмяніўся, пачаў зарабляць грошы, стаў скваппным, падзяліў усю зямлю, сям'і пакінуў толькі трэцюю частку хаты і падворка.

*(3)Лескець, Лескіць або Лескіч-якое з гэтых прозьвішчаў сапраўднае? Хутчэй за ўсё першае. Як мне растлумачылі бабуля ды бацька-„Лескіч"--гэта памылка, якую зрабілі пры пераафармленьні дакументаў, а сапраўднае прозьвішча--Лескець, якое і носіць бабуля. Што да формы „Лескіць"--то гэта, хутчэй за ўсё, транслітэратыўная памылка, даволі характэрная ў той час (магчыма так сталася й з Мартуновічамі, калісьці Мартыновіч. Martynowicz-Martunowicz,-недасьведчаны ў польскай мове чалавек лёгка мог зрабіць памылку)*

*(4) Фотаздымкі:*

*ст.35-Лескець Меланія(з права)*

*ст.36-Лескець Пётар у Нямеччыне*

*ст.40-Касабуцкі Восіп*

*ст.41-Янка Садоўскі ў польскім войску*

*ст.42Герб Побаг касабуцкіх, сям'я Касабуцкіх*

*ст.43 Мартуновіч Сяргей*

*У аздабленьні вокладкі выкарыстаны узоры ашмянскіх старадрукаў, подпіс Вялікага князя і караля Жыгімонта Аўгуста, герб Катлоў--Пелікан.*

Зьмест.

Прадмова........................................................2
**Там мае карані**............................................4
Уладары мястэчка..........................................15
Дадатак.........................................................16
Тлумачэньні...................................................18
Вусная гісторыя..............................................24
**Гісторыя храма маёй душы**...........................27
Лебедзева.......................................................28
Маркава.........................................................30
Беніца............................................................30
Дадатак..........................................................33
**Дрэва жыцьця**.............................................34
Па мячы..........................................................34
Па кудзелі.......................................................39
Дадатак...........................................................44
Зьмест.............................................................46

# Падзяка

Маім лепшым настаўніцам:Лілі Гарэлік і Раісе Гарбачэўскай за спадзяваньні і веру ў мяне.

Міхасю Казлоўскаму за добрыя парады і навуку працаваць.

Аляксандру Камінскаму за разуменьне.

Міхалу Анемпандыставу за «Народны Альбом» і натхненьне.

Васілю Харэўскаму за першую крытыку.

Каралю Мікалаю, Уладзю Валодзіну, Таццяне Вабішчэвіч за першае карэктаваньне.

АНГ, і ў прыватнасьці, Ларысе Андросік, ЗБС--за карыстаньне тэхнікай.

МІЦ-у за магчымасьці выданьня.

І канешне ж усім местачкоўцам, хто губляючы свой вольны час, дапамагаў мне сваімі ўспамінамі.

Згодна з легендай, Пелікан корміць сваіх птушанят, вырываючы мяса з уласных грудзей. Таму і стаў асацыявацца з самаахвярнасьцю на карысьць новым пакаленьням.

Літаратурна-выдавецкае таварыства **Мястэчка**, уяўляючы сябе за ідэйных прадаўжальнікаў слаўных традыцый **Філаматаў** і **Філярэтаў**, мае на мэце усімі магчымымі сродкамі працаваць на карысьць Айчыны: узбагачаць агульнанацыянальную Спадчыну, шляхам дасьледніцкай, навуковай, выдавецкай і літаратурнай дзейнасьці.

Мы не перапісваем кнігі--
мы пішам свае.

Згодна з легендай, Пелікан корміць сваіх птушанят, вырываючы мяса з ўласных грудзей. Таму і стаў асацыявацца з самаахвярнасьцю на карысьць новым пакаленьням.

Літаратурна-выдавецкае таварыства **Мястэчка**, ўяўляючы сябе за ідэйных прадаўжальнікаў слаўных традыцый **Філяматаў** і **Філярэтаў**, мае на мэце ўсімі магчымымі сродкамі працаваць на карысьць Айчыны: узбагачаць агульнанацыянальную Спадчыну, шляхам дасьледніцкай, навуковай, выдавецкай і літаратурнай дзейнасьці.

**Мы не перапісваем кнігі-- мы пішам свае.**